*А. В. Сумко*
*УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»*

# ПАСЛЯВАЕННАЕ ЖАБРАЦТВА ЯК ЭКСТРЭМАЛЬНАЯ ПРАКТЫКА Ў СІСТЭМЕ ЖЫЦЦЕЗАБЕСПЯЧЭННЯ ВЯСКОВАГА НАСЕЛЬНІЦТВА

Пасля вызвалення Беларусь знаходзілася ў цяжкім эканамічным становішчы. У вельмі неспрыяльных умовах апынуліся жыхары раёнаў, аднесеных да найбольш пацярпелых. Згодна з дакументамі, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, у 1946 г. такі статус мелі 36 раёнаў [6]. Як фіксуецца ў архіўных дакументах, становішча насельніцтва ў гэтых раёнах было вельмі складаным: «… на момант вызвалення пасяўныя плошчы складалі не больш 27 % да 1940 года, коней засталося 13 %, у асабістым карыстанні калгаснікаў хатняй жывёлы засталося 14 % адносна даваеннай колькасці. Насельніцтва галадавала, мелася вялікая колькасць знясіленых…» [6, л. 29]. Сучасныя даследаванні і матэрыялы вуснай гісторыі значна пашыраюць тэрыторыю, якую можна аднесці да «зоны бедства» (спустошаныя і спаленыя вёскі ў выніку карных экспедыцый, ваенных дзеянняў). Насельніцтва, якое пражывала ў гэтай зоне, іншы раз не мела нават базавых прадуктаў харчавання: *«Прыйшлі сюды, а тут усё згарэла, а мы ўдваіх* [з мамай – **А.С.**], *ні надзець нічога, ні… Я траву ела: і асаку, і крапіву і, як гэтыя, сындзікі гэтыя чорныя збіралі… Гаравалі после вайны. Не дай Бог той жызьні!»* (Лепельскі раён) [7, с. 244]; *« [Што кушалі?] Што шавялілася – ўсё елі… [А можа бульбу перамершую сабіралі?] Так гэта ж быў дзелікатэс! [“Ташноцікі” былі дзелікатэсам?] Да, а што ж!»*[1]. Аднаўленыя ў першы год пасля вызвалення калгасы знаходзіліся ў цяжкім стане. Пры значным скарачэнні матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, калгасныя гаспадаркі перш за ўсё павінны былі забяспечыць неабходны ўзровень вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі для дапамогі фронту, аднаўленчых працэсаў, мабілізаваць насельніцтва для выканання абавязковых паставак. Распаўсюджанай была сітуацыя, калі калгасы з пацярпелых ад нацыстаў раёнаў не маглі выканаць абавязковыя пастаўкі і разлічыцца з дзяржавай. Напрыклад, у лісце старшыні Ушацкага райсавета адзначалася наступнае: «Картофеля и овощей урожая 1944 г. мы вообще не в состоянии сдать даже одной тонны, т. к. этих культур весной 1944 г. в районе не сажалось по причинам немецкой экспедиции. В отношении сдачи в этом году мяса, молока, масла, яиц и шерсти [план] также выполнить не можем, так как у нас

---

[1] З мэтай захавання прыватнасці асабістых звестак прыводзяцца толькі ініцыялы рэспандэнтаў і пазначаецца пол: Ж. – жанчына, М. – мужчына. Запісы захоўваюцца ў Цэнтры вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай, а таксама ў асабістым архіве аўтара. Запісаў аўтар (ЗА) у 2022 г. ад М. 1934 г. н, в. Расно Сенненскі раён.

в районе не осталось ни одной курицы, ни одной овцы. Для того чтобы сдать предложенное нам мясо, у нас не хватит коров, т. к. их районе не более 200 шт., и мы сейчас не имеем возможности обеспечить нормальным питанием больных, которых с каждым днём прибавляется…» [3, с. 240]. У шэрага калгасаў магчымасці эканамічнай дапамогі насельніцтву былі вельмі абмежаваныя. Некаторыя калгасныя гаспадаркі аднаўляліся вельмі марудна і гэта адбівалася на ўзроўні жыцця вяскоўцаў. Напрыклад, у дакладной запісцы сакратару Полацкага абкама КП(б)Б ад 25.01.1946 г. паведамлялася, што ў Асвейскім раёне пасля разліку з дзяржавай па ўсіх відах хлебапаставак толькі ў пяці калгасах былі засыпаны насенныя фонды і выдадзена авансам калгаснікам ад 200 да 500 грам на працадзень (200 чалавек), у астатніх 69 калгасах (7898 чалавек) насенныя фонды засталіся не запоўненымі і на працадні нічога не было размеркавана [4, л. 1]. Неспрыяльная жыццёвая сітуацыя вызначала спектр магчымых сацыяльных дзеянняў, якія прадпрымаліся вяскоўцамі, каб вырашыць праблемы элементарнага жыццезабеспячэння ў пасляваенны час. Адной з самых экстрэмальных практык, якая дазваляла не толькі выжыць, але і атрымаць рэсурсы для аднаўлення асабістай гаспадаркі, з’яўлялася жабрацтва. Неабходна адзначыць, што храналагічныя межы пасляваеннага жабрацтва ахопліваюць не толькі першы год пасля вызвалення, але і наступныя гады, калі засуха і неўраджаі актуалізавалі праблему недахопу базавых прадуктаў харчавання.

Палявыя даследаванні фіксуюць успаміны пра пасляваенныя жабрацкія практыкі амаль ва ўсіх раёнах Беларусі. Аднак іх змест вар’іруецца ад месца пражывання рэспандэнта і паказвае наступнае: успаміны пра жабрацтва, запісаныя ў вёсках, якія знаходзіліся ў так званай зоне бедства (спустошаныя і спаленыя вёскі ў выніку карных экспедыцый, ваенных дзеянняў), – гэта ўспаміны пра ўласны жыццёвы досвед; а ўспаміны вяскоўцаў, якія пражывалі ў «зоне адноснай стабільнасці» (ступень разбурэння нязначная ці ўвогуле адсутнічала), – гэта ўспаміны сведак гэтай з’явы.

Жабрацкія маршруты залежалі ад розных фактараў: геаграфія пражывання, фізічныя магчымасці, узрост, сямейныя абставіны. Старыя і падлеткі хадзілі радыяльна, на недалёкія адлегласці, па адных і тых жа населеных пунктах. Аднак голад вымушаў пераадольваць і большыя адлегласці: *«– А ў Западную хадзілі? – Гэта ж далёка было. Помню, сабраліся ідці, гэта яшчэ 45-ы год быў, яшчэ вайна не кончыўшыся была, мама і яшчэ тры жэншчыны з Валатовак, ну і я папрасілася. Вот мы ішлі на Боркавічы, тады і прыйшлі ў Дзісну, а ўжо Дзвіна была атышоўшы ад берагу… і дождж ліў. Мы пахадзілі, ніхто нам нічога не даваў. Мне з Кацей па скібачке хлеба далі і ўсё, а гэтым нічога. І мы апяць вярнуліся ў тыя Боркавічы, і ногі распухлі, столькі прайшоўшы. Гэта можа март быў»*[1]. Іншы раз, каб дабрацца да раёнаў Заходняй Беларусі ці Латвіі, рызыкавалі жыццём, чапляліся за таварнякі, якія змяншалі хуткасць на пэўных участках чыгункі.

[1] ЗА ў 2019 г. Ж., 1935 г. н, в. Галоўчыцы Расонскі раён.

Жыхары пацярпелых раёнаў, якія знаходзіліся недалёка ад былой польска-савецкай мяжы, хадзілі пераважна ў заходнюю частку Віцебшчыны, якая была ў лепшай гаспадарчай сітуацыі, чым разбураныя ўсходнія раёны. Вельмі шмат інфармацыі пра гэта ўтрымліваюць вусна-гістарычныя матэрыялы Дзісеншчыны, зафіксаваныя падчас экспедыцыі 2019 г.: *«Ішлі-ішлі-ішлі ўсе яны, жабракі гэты, сюды. Тутака багацей жылі, сюды шлі, за Дзвіну, цераз паром…» [1]; «Прыйшла адна цётка і гаворыць: "– Можа ў вас хлеба кусочак ёсць? Дзесяць дзетак на пячы сядзяць і плачаць, есці хочуць". Паў булкі абрэзала і дала.* ***Жабравалі, хадзілі асобенна з васточнай стараны.*** *– А чаму асобенна з васточнай? – Таму, што там голад быў страшны, тут багацейшыя людзі былі»* [2].

Трэба адзначыць, што пасляваеннае жабрацтва для адных было вымушанай часовай практыкай, для другіх – эфектыўнай стратэгіяй жыццезабеспячэння, якая ў параўнанні з працай у пасляваенным калгасе прыносіла гарантаваны прыбытак у сямейны бюджэт пры меншых працоўных выдатках. Успаміны вяскоўцаў пра выпадкі, калі жабрацтва станавілася прыярытэтным заняткам у процівагу працы ў калгасе, падцвярджаюцца архіўнымі дакументамі. Напрыклад, у сакрэтным лісце на імя старшыні Расонскага сельскага савета ад аднаго з падраздзяленняў дзяржаўнай бяспекі ўтрымлівалася выпіска з прыватнага ліставання пра гаротнае становішча сям'і, члены якой некалькі разоў хадзілі жабраваць у Латвію: *«Дорогой брат Пётр я буду просить, чтобы ты помогал нам в жизни. На сегодняшний день имеем три пуда муки, и с этим запасом придется жить весь год. Видимо придётся умирать с голода! Мама вместе с Ваней уже пошли третий раз в Латвию собирать по миру и оттуда приносят куски хлеба. Тяжелое время»* [5, л. 36]. У выніку праверкі было выяўлена, што працаздольныя члены сям'і (сям'я складалася з 4 чалавек, 2 – былі вельмі сталага ўзросту, адносіліся да катэгорыі непрацаздольных і менавіта яны працавалі падчас пасяўной і ўборачнай кампаній у калгасе) амаль не ўдзельнічалі ў палявых работах, а хадзілі ў Латвію.

Праз уласны досвед ці абмен вопытам выпрацоўваўся пэўны алгарытм, які забяспечваў эфектыўнасць жабрацкай практыкі. Матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць пра тое, што мадэлі паводзін выбіраліся жабракамі з улікам асаблівасцей успрымання тых, да каго яны звярталіся. Напрыклад, можна заўважыць выбарачную практыку выкарыстання рэлігійных сімвалаў падчас прашэння міласціны, адпаведны выбар часу – хрысціянскія святы і памінальныя дні, месца для прашэння – перад касцёламі ці цэрквамі. Ва Усходняй Беларусі, дзе палітыка атэізму рэалізоўвалася больш працяглы перыяд, чым у Заходняй Беларусі, дэманстрацыя набожнасці амаль не практыкавалася. Што датычыла раёнаў Заходняй Беларусі, дзе насельніцтва вылучалася высокім узроўнем рэлігійнасці, то апеляцыя да рэлігійнай свядомасці гаспадароў была надзвычай актуальная, бо згодна з сістэмай культурных кодаў лічылася, што жабрак – гэта «божы чалавек» і адмаўляць яму нельга: *«Мы не хадзілі, а да нас пасля вайны з Васточнай Беларусі прыхадзілі. Яны ж там папаленыя былі, бедна жылі, так ішлі да нас.*

*Прыйдуць, паглядзяць ёсць ці абраз, перакрэсцяцца і "Падайце радi Хрыста"... і так ішлі, ішлі, ішлі...» (Глыбоцкі раён); «Прыйдзець, перехрэсціцца ў парозе стая і кажаць: "Памілуйце мяне, дайце мілыстыню", ну і ўсе, што яны скажуць, перахрэсцюцца і ўсе... дайце паесць, нада сям'ю карміць»* (Міёрскі раён) [8].

Наяўныя крыніцы дазваляюць зрабіць выснову, што жабрацтва было адной з эфектыўных стратэгій выжывання ў першыя гады пасля вызвалення і перш за ўсё для жыхароў тых вёсак, якія адносіліся да «зоны бедства». Большасць успамінаў пра пасляваеннае жабрацтва – гэта сведчанні пра жабрацтва вымушанага характару, якое дапамагала выжыць ва ўмовах неспрыяльнай жыццёвай сітуацыі. Прашэнне міласціны давала магчымасць не толькі пазбегнуць галоднай смерці, але і атрымаць рэсурсы для аднаўлення асабістай гаспадаркі. Жабрацкія маршруты залежалі ад наступных фактараў: геаграфіі пражывання, фізічных магчымасцей, узросту, сямейных абставін. Жабравацъ хадзілі ў раёны, якія ацалелі пасля вайны, а таксама па раёнах, дзе пераважаў адзінаасобны сектрар.

**Крыніцы і літаратура**


1. Архіў экспедыцыі 2019 года: запісалі студэнты групы 19-ГІС, Ж., 1939 г.н. г. Дзісна Міёрскі р-н.
2. Архіў экспедыцыі 2019 года: запісалі студэнты групы 19-ГІС, Ж, 1933 г.н., в. Іст Міёрскі р-н.
3. Витебщина освобожденная : октябрь 1943 – декабрь 1945 : док. и материалы / сост. : Н.В. Воронова [и др.]. – Витебск : Витеб. обл. тип., 2009.
4. Занальны дзяржаўны архіў горада Полацка (ЗГА г. Полацка). – Ф. 143. Воп. 2. Спр. 25.
5. ЗГА г. Полацка. – Ф. 1093. Воп. 1. Спр. 16.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4п. Воп. 29. Спр. 267.
7. Полацкі этнаграфічны зборнік. – Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 2.
8. Сумко, А.В. Пасляваеннае жабрацтва ў дыскурсе вуснай гісторыі Віцебшчыны / А.В. Сумко // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2020. – № 9. – С. 142–147.